Имя молодого партизана является символом верности Отчизне, силы духа, патриотизма в высшем его проявлении. В 1945 году город Лихвин был переименован в Чекалин, а в родном селе Песковатском организован дом-музей и установлен мемориал памяти юного разведчика. Именем Чекалина названы улицы в некоторых города региона, а также за пределами нашей страны. В 1972 году подвиг Чекалина был запечатлён в фильме «Пятнадцатая весна». В регионе организован детский лагерь имени Саши Чекалина.

Музей Оружия – символ защиты обороны Тулы, патриотизма, изобретательности, мастерства оружейного производства.

Народное название «шлем» музей получил благодаря своей форме - пятиэтажное здание, выстроенное в форме гигантского воинского шлема. Считается одним из старейших в России, созданный благодаря распоряжениям Петра I и Екатерины II. Культурная память хранит знание о зарождении коллекции музея именно по указу Петра I.

С Музеем Оружия связаны имена тульских оружейников: Дегтярёв, Мосин, Токарев, Калашников, Пастухов и другие.

В наивном сознании Музей Оружия является визитной карточкой Тулы, так как город принято считать оружейной столицей. Действительно, благодаря своему расположению и внешней мануфактуре, это самый большой и современный музей Тулы. С Музеем оружия связан целый комплекс различных мероприятий: интерактивные экскурсии по истории оружейного дела, выставки, научная работа по сохранению экспонатов, тематические праздники, «Ночь музеев», сотрудничество с Тульским оружейным заводом, с Туламашзаводом.

Современное здание музея было открыто в 2012 году, ранее располагалось в стенах Тульского Кремля.

**Заключение.** Анализ прецедентных имён концептосферы «Защита Отечества» позволяет выявить рад закономерностей и собрать богатейший материал для дальнейшего составлени словаря символария региональной идентичности туляка.

1. Токарев Г. В. Дискурсивные лики концепта: Монография. – Тула: 2003.

## СУЧАСНЫ МУЖЧЫНСКІ ІМЯННІК ЖЫХАРОЎ ВЕРХНЯДЗВІНШЧЫНЫ: СКЛАД, ДЫНАМІКА

***Панкрат А.М.,***
*выпускнік ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Семянькова Г.К.,*** *канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Уласнае асабовае імя, імя, антрапонім.
Keywords. Own personal name, name, anthroponym.

З трох элементаў афіцыйнай формулы наймення асобы найбольш старажытным з'яўляецца ўласнае асабовае імя. Да прыняцця хрысціянства славяне выкарыстоўвалі два тыпы імён, утвораных на базе славянскай лексікі. Першы – складаныя імёны тыпу Володымер, Всеволод, Ярослав, Станислав. Другі – імёны, утвораныя семантычным шляхам ад апелятыўнай лексікі (Волк, Горностай, Жук і інш.).

Традыцыйныя царкоўныя імёны, якія царква разам з распаўсюджваннем хрысціянства ўзмоцнена пашырала сярод усходнеславянскага насельніцтва, не маглі адразу ж выцесніць звычныя славянскія імёны. Таму аж да XVII ст. у помніках пісьменнасці мы побач з хрысціянскімі імёнамі часта знаходзім старыя славянскія імёны. Праўда, у гэты час іх функцыя некалькі змянілася.

Іншамоўныя па паходжанні ўласныя асабовыя імёны ў канкрэтным моўным асяроддзі перажылі цэлы шэраг фанетычных і фанетыка-марфалагічных змен. У некаторых выпадках гэтыя змены былі настолькі сур'ёзнымі, што імя набывала зусім іншы выгляд [2].

Вывучэнне ўласных асабовых імён жыхароў пэўнай тэрыторыі дазваляе выявіць асаблівасці называння ў пэўных рэгіёнах, агульныя для Беларусі і спецыфічныя менавіта для гэтай тэрыторыі прынцыпы наймення, культурныя і нацыянальныя традыцыі, склад насельніцтва і іншае. У сувязі са сказаным *актуальнасць* праведзенага даследавання бачыцца нам відавочнай. *Мэта* артыкула – выявіць склад і асаблівасці ўласных асабовых імён жыхароў Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці на сучасным этапе.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі ўласныя запісы, зробленыя ў 2020 – 2022 гг. шляхам апытання жыхароў вёсак Булаўкі, Валынцы, Прудзінкі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. Метады даследавання – аналітычны, апісальны, метад супастаўлення.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Падсістэма мужчынскіх імён традыцыйна з'яўляецца эталоннай часткай антрапанімікону. Шматлікія змены гэтай падсістэмы ў большасці выпадкаў вызначаюць і кірунак дынамічнага мадыфікавання суадноснай падсістэмы жаночых імён. Падсістэма мужчынскіх імён – анімічнае збудаванне, якое складаецца з вялікай колькасцю адзінак і адзначаецца шырокім прадстаўніцтвам уласных найменняў асоб мужчынскага полу, якія традыцыйна ўваходзяць у склад антрапанімнага інструментарыю нацыянальнага іменніка [1, с. 33]. Размеркаванне колькасці носьбітаў па імёнах прадстаўлена ў табліцы.

Табліца – Размеркаванне колькасці носьбітаў па імёнах

| Імя | Год нараджэння чалавека, колькасць носьбітаў імені | Усяго носьбітаў імені |
|---|---|---|
| Алег | 1953 (1), 1954 (1), 1957 (2), 1960 (2), 1980 (5), 1985 (6), 2009 (9), 2013 (10), 2016 (12), 2017 (13) | 61 |
| Аляксандр | 1954 (2), 1955 (2), 1958 (3), 1962 (1), 2005 (3), 2008 (7), 2017 (17) | 35 |
| Аляксей | 1956 (3), 1957 (3), 1987 (6), 2021 (21) | 33 |
| Андрэй | 1958 (4), 1964 (3), 1989 (6) | 13 |
| Артур | 1970 (4), 1991 (7), 2022 (5) | 16 |
| Арцём | 1977 (4), 1993 (7), 2021 (6) | 17 |
| Багдан | 1959 (1), 1981 (5), 1996 (8) | 14 |
| Вадзім | 1982 (6), 2001 (8), 2007 (1) | 15 |
| Вячаслаў | 1960 (1), 1978 (5), 2002 (3) | 9 |
| Георгій | 1961 (1), 1971 (5), 2003 (9), 2009 (2) | 18 |
| Глеб | 1969 (4), 2014 (10), 2015 (2) | 16 |
| Данііл | 1965 (3), 2021 (18), 2022 (22) | 43 |
| Іван | 1961 (3), 2015 (10), 2018 (18) | 31 |
| Ігар | 1959 (1), 2002 (8), 2018 (14) | 23 |
| Канстанцін | 1958 (2), 1999 (8), 2019 (15) | 25 |
| Мацвей | 1957 (3), 1993 (7), 2010 (9), 2019 (19) | 38 |
| Мікалай | 1956 (1), 1994 (7), 2011 (9) | 17 |
| Мікіта | 1957 (2), 1999 (8) | 10 |
| Міраслаў | 1958 (1), 1986 (6), 2015 (11), | 18 |
| Пётр | 1955 (1), 1957 (1), 1979 (5), 1983 (6), 2004 (9), 2016 (16) | 38 |
| Раман | 1962 (2), 2003 (8) | 10 |
| Руслан | 1967 (4), 1990 (6) | 10 |
| Станіслаў | 1966 (3), 2004 (8) | 11 |
| Уладзімір | 1968 (4), 2000 (8) | 12 |
| Уладзіслаў | 1972 (5), 1995 (7) | 12 |
| Усевалад | 1956 (2), 2012 (9), 2020 (2) | 13 |
| Фёдар | 1963 (3), 1988 (6) | 9 |
| Цімафей | 1973 (4), 1992 (7) | 11 |
| Усяго носьбітаў | – | 578 |

Як бачна з табліцы, найбольш распаўсюджанымі мужчынскімі імёнамі на Верхнядзвіншчыне з'яўляюцца Алег, Данііл, Мацвей, Пётр, Аляксандр, Аляксей, Іван, Канстанцін, Георгій, Ігар, Міраслаў.

Пры гэтым бачна, што некаторыя імёны сустракаюцца больш-менш раўнамерна ў людзей розных узростаў (напрыклад, імя Алег, Аляксандр, Пётр). Так, імя Алег сустракаецца ў носьбітаў 1953, 1954, 1957, 1960, 1980, 1985, 2009, 2013, 2016, 2017 гадоў нараджэння. Аляксандр – у носьбітаў 1954, 1955, 1958, 1962, 2005, 2008, 2017 гадоў нараджэння. Носьбіты імені Пётр нарадзіліся ў 1955, 1957, 1979, 1983, 2004, 2016 гадах.

Іншыя імёны (Раман, Руслан, Цімафей) былі папулярныя ў асобныя гады і таму носьбіты гэтых імён размеркаваны па гадах нараджэння нераўнамерна (перарывістае выкарыстанне). Напрыклад, 2 носьбіты імені Раман нарадзіліся ў 1962 г. і 8 чалавек з гэтым імем – у 2003 г.; 4 чалавекі з імем Цімафей нарадзіліся ў 1973 г., 7 чалавек – у 1992 г. Тое ж (канцэнтрацыю па асобных гадах пры агульнай невялікай колькасці носьбітаў) можна адзначыць і па такіх мужчынскіх імёнах, як Станіслаў, Уладзімір, Уладзіслаў, Мікіта, Фёдар.

**Заключэнне.** Такім чынам, сучасныя мужчынскія імёны, якія сёння ўжываюцца на Верхнядзвінўчыне, у пераважнай большасці запазычаны з іншых моў (грэчаскай, лацінскай, старажытнаяўрэйскай, германскіх, скандынаўскіх і інш.), з якіх яны трапілі ў нашу мову праз грэчаскую і царкоўнаславянскую разам з прыняццем хрысціянства. Самымі распаўсюджанымі мужчынскімі імёнамі на Верхнядзвіншчыне з'яўляюцца Алег, Данііл, Мацвей, Пётр, Аляксандр, Аляксей, Іван, Канстанцін, Георгій, Ігар, Міраслаў.

Параўнанне зрэзаў 1950 – 1969 гг. і 2000 – 2022 гг. паказвае, што найбольш ярка назіраецца рост папулярнасці такіх мужчынскіх імён, як Артур, Арцём, Вадзім. Зніжэнне папулярнасці відавочнае ў імёнах Андрэй, Мікіта, Фёдар.

1. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія. Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М.В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1966. – 328 с.
2. Мезенка, Г.М. Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г.М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.] – Віцебск : УА "ВДУ імя П. М. Машэрава", 2009. – 254 с. – URL: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/2378/5 (дата звароту: 03.05.2022).

## ПРОБЛЕМА АВТОРСКОГО СОЗНАНИЯ В ПЬЕСЕ Л.Е. УЛИЦКОЙ «ЮБИЛЕЙ. ДУБЛЬ ДВА»

***Польников М.О.,***
*аспирант ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – **Крикливец Е.В.,** доктор филол. наук, доцент*

Ключевые слова. Современная русская драматургия, авторское сознание, реализм, постмодернизм, жанровая структура драмы.

Keywords. Modern Russian drama, authorial consciousness, realism, postmodernism, genre structure of drama.

Русская драматургия конца XX – начала XXI в. с точки зрения историко-литературного процесса рассматривается многими исследователями в контексте жанровой модификации, именуемой «новой драмой». Новая драма предполагает высокий уровень творческой экспериментальности, которая направлена на поиск нестандартных художественных решений и форм и установление различных связей с другими видами искусства [3]. На фоне исследования современной драматургии возникает необходимость внедрения новых литературоведческих категорий, используемых в ходе анализа произведения. В этой связи актуальной становится проблема авторского сознания и способов осуществления авторской активности в тексте драмы.

Цель данной работы – определить способы воплощения авторского сознания в пьесе Л.Е. Улицкой «Юбилей. Дубль два».

**Материал и методы.** Материалом исследования послужил текст пьесы Л.Е. Улицкой «Юбилей. Дубль два» (опубликована в 2020 году). В качестве методов исследования были использованы культурно-исторический и описательно-аналитический, которые позволили проанализировать данное произведение в контексте взаимосвязи категорий метод – жанр – стиль.